

Паўлаў Уладзімір, нарадзіўся 25.10.1935 г. у вёсцы Замошша Любанскагараёна Менскай вобласці ў сялянскай сям’і.
У 1954 г. скончыў Дарасінскую сярэднюю школу і працаваўлітработнікам любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы». Служыў у Савецкай Арміі (1954-1957). У 1962 г. скончыў аддзяленне журналістыкіБеларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў загадчыкам літаратуры імастацтва, адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» (1962- 1967), адказным сакратаром кінабюлетэня «На экранах Беларусі» (1967-1971), літкансультантам СП БССР (1971-1972, 1986-1988), загадваў рэдакцыямі паэзіі, затым збору твораў і выбраных твораў выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1972-1985). З 1990 г. — намеснік старшыні СПБеларусі. Сябра СП СССР з 1962 г.
Першы верш надрукаваў у 1954 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтарзборнікаў паэзіі «Узлётная паласа» (1960), «Далягляд» (вершы і паэма, 1964), «Светацені» (1967), «Начная балада» (вершы і паэма, 1971), «Сонца купаецца» (вершы, паэма, 1976), «Каласы радкоў» (1979), «Сляза на вейцы» (1982), «Гадавое кальцо» (1986).
Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Годы нашы — птушкі» (1970), «Ад агню і мяча» (1973), для дзяцей «Пажарніца» («Тайна бункера № 7»,аповесць, 1968), «Чуж-чужаніца» (аповесць, 1979), «Радзімкі» (1989). У 1987 г. выдадзены Выбраныя творы ў 2 тамах.
Пераклаў раманы Я.Фельдэака «Чужая дачка» (1979), У.Багамолава «Момант ісціны» («У жніўні сорак чацвёртага», 1984), асобныя творы пісьменнікаў народаў СССР.